Зубчонак, Н. А.
Беларуская журналістыка ў перыяд станаўлення нацыянальна-дэмакратычнага руху (1906—1916 гг.) : дапам. для студэнтаў Інстытута журналістыкі,
/ Н. А. Зубчонак. Мінск ; БДУ, 2010.

### 2.2.1. МОЎНАЯ ПРАБЛЕМА І ПЫТАННІ АДУКАЦЫІ НА СТАРОНКАХ ДРУКУ

Філосаф, гісторык і грамадскі дзеяч Ф. Шантыр пісаў: «Але, відаць, наша, беларусаў, доля такая, што калі гутарка ідзе аб тым, ці мае права беларус жыць, то ўсе законы ідуць шыварат-навыварат» [74, с. 1]. Яго словы ў 1918 г. пацвердзілі важнасць той вялікай працы, якую распачала беларуская інтэлігенцыя пасля першай рускай рэвалюцыі. Гэта была не роспач аб няўдалым адраджэнні, гэта заклік яшчэ раз задумацца над тым, што было зроблена няправільна.

Праблема мовы як пацвярджэнне адметнасці нацыі стала асноўным аб’ектам публіцыстычных выступленняў першых беларускіх выданняў. У свой час «Наша ніва» пісала: «Народы, якія пачынаюць будзіцца, заўсёды імкнуцца захаваць сваю мову, бо яна ёсць канечны варунак для захавання сваёй душы, а значыць, і найкарацейшы фундамент, на якім будуецца нацыянальнае жыццё паводле цяперашніх культурных намаганняў» [«Наша ніва», 1912, № 26].

Моўны аспект стаў першым пытаннем ў сістэме грамадска-палітычных палажэнняў, якія былі прапанаваны беларускай нацыянальнай публіцыстыкай. У пераломны гістарычны момант важна было напомніць народу, што яго нацыянальная мова з’яўляецца формай духоўнай культуры, без якой далейшае развіццё краіны проста немагчыма. Народ павінен спачатку вярнуць страчаныя раней каштоўнасці, а ўжо потым развівацца далей. Першым і вельмі важкім крокам у гэтым кірунку было з’яўленне беларускіх нацыянальных выданняў. Увогуле ж, самі падзеі, якія развіваліся вакол першай буржуазна-дэмакратычнай рэвалюцыі ў Расіі, сфарміравалі ў народных масах імкненне разабрацца ў акаляючым жыцці, выклікалі проста ліхаманкавы попыт на ідэалагічныя каштоўнасці. Беларуская прэса набывала папулярнасць, колькасць выданняў паступова павялічвалася. У артыкуле «Правінцыя будзіцца» «Наша ніва» пісала: «Край наш можа пахваліцца: не кажучы ўжо аб губернскіх гарадах, з якіх кожны мае адну-дзве газеты, не кажучы аб Вільні, дзе іх дзесяткі» [«Наша ніва», 1912, № 11]. Станавілася зразумелым, што пісаць, звяртацца да масавага чытача неабходна было на беларускай мове.

Моўная праблема ўключае мноства састаўляючых. Галоўная яе асаблівасць ў тым, што яна не можа быць проста культуралагічнай. Пытанне мовы ў дзяржаве набывае яшчэ і вострае палітычнае адценне,

пакольki нацыянальная палітыка трымаецца на рэальным палажэнні мовы ў краіне. Гэта ў свой час добра разумелі прадстаўнікі беларускай інтэлігенцыі пачатку XX ст. Заклікі развіваць нацыянальнцую школу, традыцыі, культуру і літаратуру нельга адносіць толькі да культурна-асветніцкага кірунку дзейнасці беларускіх выданняў. Сэнс амаль дзесяцігадовай працы па адраджэнні Беларусі быў вопытам будаўніцтва новай дзяржавы. Станавілася зразумелым, што народ, «у якім гістарычна выпрацавалася здольнасць да жыцця і жыццёвай сілы, будзе заўсёды змагацца і бараніць свае правы, а значыць, можа парушаць агульны спакой датуль, пакуль не будуць задаволены яго нацыянальныя патрэбы, правы і намаганні забеспячэння яго нацыянальнага быту» [25, с. 28].

Законным правам народа з'яўляецца права размаўляць і вучыцца на роднай мове. Сапраўды, неабходнасць свядомага нацыянальнага жыцця выцякае не толькі з самога факту жыццядзейнасці чалавека, яго бытавога ўкладу, якія, у рэшце рэшт, ажыццяўляюцца па законах прыроды. Тут вельмі важна яшчэ, каб жыццёвы ўклад адпавядаў дастойным чалавечым умовам існавання ўвогуле. Толькі ў гэтым выпадку нацыя будзе лічыцца раўнапраўнай побач з іншымі народамі свету. Ужо ў першым нумары «Наша ніва» пісала: «Мы са свайго боку будзем старацца, каб усе беларусы, што не ведаюць, хто яны ёсць, – зразумелі, што яны беларусы і людзі, каб пазналі свае правы і памагалі нам у нашай рабоце» [«Наша ніва», 1906, № 1].

Першы шлях, які прывядзе народ да нацыянальнага адраджэння, — гэта шлях адукацыі народа. Нацыянальная мова ніколі не стане набыткам нацыі, калі не зойме належнага месца ў дзяржаўнай палітыцы. Нельга разглядаць асобна пытанні мовы, асветы народа і дзяржаўнага будаўніцтва. Шмат месца легальная беларуская прэса адводзіла праблеме адукацыі, адукацыі нацыянальнай. З першых сваіх нумароў аб гэтым загаварыла «Наша ніва», побач з ёй «Bielarus», «Дзянніца», «Маладая Беларусь», «Раніца», нарэшце «Homan» і іншыя выданні. Беларуская мова павінна была заняць сваё месца ў народнай школе, бо ад гэтага ў вялікай ступені залежыць будучыня цэлага народа. Не аднаму пакаленню беларусаў насаджаліся чужыя звычаі і традыцыі. Такая палітыка дала свой плён – маладыя людзі пачалі цурацца сваіх каранёў, або проста не задумваліся над будучыняй. У звароце «Да вясковай моладзі беларускай» «Лучынка» пісала: «Не хапае табе толькі навукі: навукі свабоднай, навукі зразумелай, навукі ў тваёй роднай беларускай мове, каторая табе паказала б, раз'ясніла б, хто ты такая, беларуская моладзь, да якога ты належыш народу і краю» [«Лучынка», 1914, № 2].

Аналізуючы матэрыялы беларускіх выданняў пачатку стагоддзя, заўважаеш, што з кожным годам праблема нацыянальнага выхавання моладзі набывала ўсё большую акрэсленасць і значнасць. Паступова выкрышталізоўвалася разуменне неабходнасці ўсталявання пэўных

змен. І адбывалася гэта не толькі ў асяроддзі ўжо сталай нацыянальна свядомай інтэлігенцыі, але і сярод маладзейшых яе прадстаўнікоў. Калі ў першыя гады выхаду газет у большасці матэрыялаў прысутнічалі разважанні аб неабходнасці нацыянальна-культурнай працы, дык далей мы бачым, што з'явіліся пэўныя прапановы, якія нават можна назваць своеасаблівай праграмай дзяржаўнасці. Беларускі рух паступова пакідаў свае межы і тым самым атрымліваў усё большую значнасць.

Беларуская студэнцкая моладзь ў Пецярбургу прапаноўвала сваю праграму мерапрыемстваў па адраджэнні роднага краю. У адзіным нумары часопіса «Раніца», які быў падрыхтаваны студэнтамі ў чэрвені 1914 г., змешчаны артыкул «Праца і навука. Што нам рабіць на Беларусі», у якім моладзь прадстаўляла сваё бачанне праблемы нацыянальнага адраджэння. Неабходна было пашыраць асвету сярод простых людзей, выдаваць беларускія кнігі і газеты; гутарыць з сялянамі, запэўніваць іх, што беларуская інтэлігенцыя працуе дзеля іх карысці; важна вывучаць беларускі край, збіраць і захоўваць яго каштоўнасці. Гэта тая невялікая частка працы, якая дапамагала маладым людзям падрыхтавацца да будучай грамадскай працы.

Нават у перыяд спаду рэвалюцыі і жорсткай рэакцыі пытанне аб нацыянальнай школе набывала далейшую значнасць. Сапраўды, зніжэнне рэвалюцыйнай актыўнасці ў краіне зусім не азначала змяншэння агульнадэмакратычных настрояў. Калі ў 1910 г. на адным з пасяджэнняў Дзяржаўная дума разглядала справу аб народнай школе, «Наша ніва» змясціла матэрыял, дзе закранула вельмі важны аспект праблемы: месца нацыянальнай школы ў вялікай шматнацыянальнай дзяржаве. Рэдакцыя сцвярджала, што калі ў адной дзяржаве, апрача наймацнейшага і найвялікшага народа-гаспадара, ёсць яшчэ і другія нацыі, то для іх першаснае значэнне набывае менавіта «нацыянальная» школа, а не «дзяржаўная», якая служыць інтарэсам урада. Рэдакцыя асуджала палітыку ўрада ў галіне адукацыі: «Мудра пастаўленая “дзяржаўная” школа... не ўбівае ў чалавека, дзіця, быццам ён рускі, калі ён татарын, жыд, паляк... ці беларус, яна шануе кожную нацыю, кожную мову...» [«Наша ніва», 1910, № 44-45].

Побач з дзяржаўнай і палітычнай значнасцю моўна-адукацыйнай праблемы ў Паўночна-Заходнім краі, беларускія выданні таго часу звярталі шмат увагі і на яе другі бок – маральна-этычны. Як правільна выхаваць дзіця, каб яно потым не цуралася сваіх бацькоў, шанавала родныя карані, ніколі не адрывалася ад зямлі, што яго ўзгадавала? У 1911 г. «Наша ніва» надрукавала шмат артыкулаў па праблеме выхавання, бо яна непарыўна звязана з праблемай мовы. «А трэба, пакуль дзіця малое, вучыць яго гаварыць роднай мовай, шанаваць гэту мову: трэба перасцерагаць, каб не перакручвалі яе чужымі словамі, трэба, каб маці пела дзецям свае песні простыя, прывучала шанаваць прадзедаўскія абычаі, – тады, як сынок твой вырасце і пойдзе ў чужыя людзі, нічым з душы яго не выб’юць любові да свайго роднага, і, дзе б

ён ня быў – хоць за морам, яго заўсёды пацягне сэрца ў свой куток, да сваіх бацькоў» [«Наша ніва», 1911, № 3].

У рэчышчы адукацыйна-выхаваўчых праблем неабходна засяродзіць увагу яшчэ на адным пытанні, аб якім шмат пісалі беларускія выданні, – праблеме выхавання нацыянальнай інтэлігенцыі. Менавіта ад яе і будзе залежаць лёс беларускага адраджэння. Існуючая сістэма расійскіх парадкаў у краіне парадзіла пакаленне, якое забылася пра свой народ, а надзеі на лепшую будучыню звязвала толькі з матэрыяльным дабрабытам або з іншай краінай. Тое, што беларусы апынуліся ў такім гаротным становішчы, «заслуга» тых, хто ў свой час ім здрадзіў. «Гляньце на народ, на бацькаўшчыну. Чыімі рукамі прыдушан ён, чыімі рукамі раскрадзена прадзедаўскае слова?», – пісала «Наша ніва» [«Наша ніва», 1913, № 29]. Карані гэтай праблемы ў выхаванні, у недасканаласці народнай школы ў краі, бо яна паступова пашырала прорву паміж людзьмі, разрыў паміж вяскоўцамі — носьбітамі духоўнай культуры народа, і горадам, які забівае ў чалавеку памяць аб сваіх каранях, робіць інтэлігента, што выйшаў з народа, раўнадушным да бацькаўшчыны. «Калі горад не будзе забіваць ў душы гэтай моладзі таго, чым яна звязана з вёскай: любові до ўсяго роднага, – тады і народныя інтэлігенты поўнымі жменямі панясуць зярняты культуры ў вёску, а яны тамака паўсходзяць, і ўзгадуюцца тысячы карысных і свядомых працаўнікоў на карысць нашага народа» [«Наша ніва», 1911, № 18--19].

Беларускія публіцысты слушна адзначалі, што развіццё асветы і адукацыі ў краі ідзе ў няправільным напрамку. Паступова ажыццяўляўся пошук прычын, што прывялі да падобнага становішча. Яны (прычыны) — ў сістэме парадкаў, якія дзейнічаюць у краіне. І яшчэ, што вельмі важна, у той абыякавасці, быццам бы нежаданні беларусаў узняць галаву і сказаць сваё важкае слова, у нізкім узроўні нацыянальнай свядомасці. Гэта не проста адзнака часу, вынік пэўных гістарычных абставін. Гэта яшчэ і вялікая загана, папрок народу, бо ён не жадае змагацца за лепшае жыццё. Так, газета «Bielarus» бачыла заганы нашай адукацыі ў кепскім выхаванні дзяцей, у неразуменні народам сутнасці нацыянальнага слова, і нарэшце, у «нейкай дзіўнай устыдлівасці» сваёй прыналежнасці. У артыкуле «Кірунак нашай адукацыі» газета пісала: «Устыд свайго народу робіць часта з нас пасмешышча ў вачах нашых суседзяў» [«Bielarus», 1914, № 29--30].

Рэчаіснасць патрабавала карэнных змен, ажыццявіць якія магчыма было толькі на дзяржаўным ўзроўні. Сістэма законаў, што панавалі ў Расіі, ніякім чынам не спрыяла павышэнню агульнага ўзроўню пісьменасці. Ураду было зручней трымаць народ у паслухмянасці і «цемнаце». Расійская дзяржаўнасць, якая доўгі час будавалася на адзінстве «самадзяржаўя, праваслаўя і народнасці», не прымала пад ўвагў памкненні беларусаў да ведаў, да цывілізаванага свету. У працэсе рэвалюцыйна-дэмакратычных пераўтварэнняў праводзіць падобную

палітыку станавілася ўсё цяжэй. Але хоць урад і праціВіўся адкрыццю школ, яны ўсё ж такі адкрываліся, народ цягнуўся да навукі. Больш таго, наспела ўсведамленне таго, што адукацыя павінна ажыццяўляцца толькі на нацыянальнай глебе. Беларускія выданні пачалі друкаваць матэрыялы, дзе настойвалі на неабходнасці развіцця асветы ў сваім краі, бо толькі навука дапаможа вырваць чалавека з палону «цемнаты» і «забітасці». У 1913 г. газета «Bielarus» пісала: «I гасударству справа нашага адраджэння ні на макавае зерне зашкодзіць не магла, бо вядома, што чым больш будзе ў гасударстве разумных ды вучоных людзей, тым больш ў ім будзе парадак, тым яно будзе мацнейшае» [«Bielarus», 1913, № 29].

Праблема асветы і адукацыі ў Беларусі з пачатку ХХ ст. набыла вострае палітычнае значэнне. У публіцыстычных матэрыялах настойліва падкрэслівалася, што магутнасць дзяржавы ў многім залежыць ад колькасці ў ёй адукаваных людзей, а спачатку проста пісьменных. Узровень жа пісьменнасці ў Паўночна-Заходнім краі ў гэты час быў даволі высокі (як гаварылася ў пачатку работы), у параўнанні з сярэднім паказчыкам па Расійскай імперыі і з узроўнем яе ў іншых рэгіёнах краіны (32 % супраць 28,4 %).

Аналізуючы змест публіцыстыкі міжрэвалюцыйнага перыяду, неабходна адзначыць, што матэрыялы, якія друкаваліся ў беларускіх выданнях розных напрамкаў, якраз і стваралі тую цэласнасць ва ўспрыняцці і адлюстраванні рэчаіснасці. Яны нібыта дапаўнялі адзін аднаго.

Распрацоўка пытанняў, звязаных з пашырэннем асветы і навукі ў Паўночна-Заходнім краі, будзе няпоўнай, калі не сказаць яшчэ пра адзін бок гэтай праблемы – яе духоўны аспект. Каталіцкая газета «Bielarus», якая выходзіла ў Вільні на працягу 1913–1915 гг., зрабіла вельмі шмат у гэтым кірунку. Шлях да адраджэння абавязкова праходзіць і праз духоўнае ачышчэнне асобы, ён – у імкненні да ведаў, у любові да людзей, у дабрыні і міласэрнасці. Нацыянальны характар выхоўваецца не толькі праз традыцыі, здабыткі культуры і літаратуры. Ён выхоўваецца таксама і праз сцвярджэнне агульначалавечых гуманістычных ідэалаў, якія на працягу многіх стагоддзяў служаць людзям. «Добрым жа беларусам будзе толькі той беларус з цела, хто стараецца шырыць свядомасць і здаровую асвету між ўсімі беларусамі» [«Bielarus», 1914, № 13]. Беларусы-праваслаўныя, беларусы-каталікі — прыхільнікі нацыянальнага адраджэння — служылі адной вялікай справе народнай карысці.

Беларуская публіцыстыка разглядаемага перыяду не праводзіла мяжы паміж пытаннямі мовы, адукацыі і выхавання. На першае месца ў справе нацыянальнага адраджэння выходзіў менавіта моўны аспект. Публіцысты добра разумелі і імкнуліся давесці да ўсяго народа тое, што без захавання нацыянальнай мовы, надання ёй належных правоў у краіне, не можа быць самастойнага народа, незалежнай дзяржавы.